Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, Карла Маркса, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 28 (172)	1—10 кастрычніка	1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд за дэкаду—Довгер.

Метэаралагічная характарыстыка за першую дэкаду кастрычніка і жнівень м-цы і табліцы вынікаў мет. назіранняў за дэкаду кастрыч. і жнівень месяц.—Н. Малішэўская.

С.-г. гідраметэаралагічная характарыстыка—В. Стэфановіч.

Аб падачы с/г тэлеграм і запаўненні дэкадных бланкаў.—В. Стэфановіч.

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД ЗА ДЭКАДУ

Надвор'е першай дэкады кастрычніка на тэрыторыі БССР можна падзяліць на тры перыяды: першы перыяд—з 1-га па 2-е кастрычніка характарызуецца праходжаннем франтоў, якія з'яўляліся межамі падзелу паміж порцыямі марскога палярнага паветра і стваралі воблачнае надвор'е і невялікія дажджы, пераважна ў заходняй частцы БССР. Мінімальная тэмпература ў гэты перыяд даходзіла да —2° у паўночна-заходніх раёнах і да 3°—5° у астатніх частках БССР. Максімальная тэмпература была ад 9° да 12°.

У другі перыяд з 3-га па 6-тае кастрычніка Беларусь была захвачена масамі субтрапічнага паветра, якое рухаецца па тэрыторыі БССР з паўднёвага захаду. Утаржэнне гэтага паветра стварыла ў нас павышэнне тэмпературы, якое даходзіла ў дзень да 20°—25°, а ноччу да 8°—12°. У дзень назіралася значная воблачнасць, ночы-ж пераважна ясныя—спрыяючыя вялікаму начному спрамяненню, у выніку чаго ўся тэрыторыя Беларусі была пад уздзеяннем туманаў радыацыйнага характару, якія трымаліся да 10-ці гадзін раніцы. Гэтыя туманы былі настолькі густымі, што давалі ападкі вымяраемыя ў некалькіх дзесятых м/м.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі наглядалі мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	8	12	16	12	16	16	12	10	13	10	—	12	—	21	3	1
	3	Полацк	8	12	15	13	16	16	13	11	13	9	—	13	7	20	4	1
	—	Вялікія-Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	65	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	4	9	14	14	15	15	14	13	11	8	—	12	6	21	—1	1
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	7	10	15	13	15	16	13	12	12	10	—	12	—	21	4	1
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	7	11	12	16	16	16	15	14	12	9	—	13	7	23	3	10
	16	Менск	8	12	14	16	18	16	14	13	12	9	—	13	7	25	4	10
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	8	11	12	17	18	16	13	13	12	9	—	13	7	24	3	10
	25	Асіпавічы	8	13	13	17	17	16	14	14	12	8	—	13	8	26	2	10
	10	Орша	6	10	13	15	15	16	15	12	12	8	—	12	7	21	0	1
	19	Горкі	4	11	13	16	14	15	15	13	12	8	—	12	7	21	—2	1
III. Цэнтральны (раўніны)	148	Клічаў	—	—		—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	9	11	14	16	18	16	14	13	12	9	—	13	—	24	4	10
	30	Мар.-Сосны	9	11	14	18	18	17	13	13	12	8	—	13	8	24	1	1
	21	Магілеў	6	12	13	15	16	15	15	13	11	8	—	12	7	23	2	10
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	4	11	13	17	16	16	14	13	12	8	—	12	8	23	—1	1
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	7	11	12	17	15	16	14	12	12	8	—	12	8	23	2	10
	32	Жлобін	7	12	13	17	16	16	14	13	10	8	—	12	8	24	2	10
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	10	13	15	18	17	16	13	14	11	12	—	14	9	25	4	10
	37	Калінкавічы	9	12	15	18	16	15	15	14	11	8	—	13	8	25	2	10
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	6	11	13	17	16	17	13	13	12	9	—	13	8	24	3	10
	35	Васілевічы	8	11	13	18	16	17	13	14	10	7	—	13	8	25	1	10
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

назіранняў за 1—10 кастрычніка 1934 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы: Максімал.	Тэмпература паверхні глебы: Мінімальн.	Тэмпература паверхні глебы: Число, калі нагляд. мінімум	Ападкі ў мм: 1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	Метэаралагічныя з'явы (у дужках адзначаны числы)
73	—	2	10	0.6	..	..	0.3	1.0	24.0	2.0	..	0.1	..	—	28.0	туман (2) граза (6)
73	--	—	—	0.1	0.4	..	0.3	0.2	1.0	6.0	..	..	..	—	8.0	туман (2, 7)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
69	22	—4	1	..	0.3	..	3.0	1.0	..	..	..	..	..	—	4.3	—
70	—	0	10	..	0.6	..	10.0	..	0.3	2.0	0.1	..	1.0	—	14.0	туман (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	—	5	10	..	..	..	..	..	..	..	..	..	1.0	—	1.0	туман (3, 6)
67	25	6	10	1.0	..	0.1	..	0.2	1.0	1.0	0.1	..	1.0	—	4.5	туман (2, 5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
70	33	3	10	1.0	0.2	0.1	0.2	0.1	..	0.1	..	..	0.1	—	1.8	туман (10)
60	—	4	10	0.1	..	..	0.6	..	..	..	..	..	..	—	0.7	туман (3, 6)
64	20	0	1	..	0.1	..	5.0	0.1	..	..	..	..	..	—	5.2	туман (3) граза (5)
59	28	—2	1	..	0.1	0.1	1.0	0.3	—	—	—	—	—	—	—	туман (3) граза (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
73	—	5	10	..	0.4	0.3	0.1	..	..	1.0	4.0	..	1.0	—	6.8	туман (2, 3)
66	—	—	—	1.0	0.3	..	0.1	..	0.4	3.0	..	..	1.0	—	5.4	туман (3, 8)
56	—	—	—	..	..	..	7.0	0.1	..	..	..	..	..	—	7.1	граза (4) туман (3)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
52	..	..	..	1.0	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	1.0	туман (3, 6)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
51	28	—2	1	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	—	—
50	—	—	—	..	0.1	..	..	..	0.1	..	..	..	..	—	0.2	туман (3, 5)
64	—	—	—	..	0.1	..	..	..	7.0	2.0	..	..	0.5	—	9.6	туман (3, 8)
51	—	—	—	0.3	0.2	..	..	0.1	..	..	..	..	..	—	0.6	туман (3, 10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
48	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	туман (3)
47	—	—3	10	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	туман (4, 10)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 кастрычніка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў % %	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхоўага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	S	4	W	12	—	10	8	вільготная
	3	Полацк	SE	4	SE	4	—	9	8	„
	—	Вялікія Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	—	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	E	4	SE	9	27	8	6	вільготная
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	SW	—	—	8	6	вільготная
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	2	SW	4	—	10	3	вільготная
	16	Менск	S	2	SE	7	—	8	3	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	S	4	SE	7	—	8	3	сухая
	25	Асіпавічы	SE	2	SE	7	—	6	2	вільготная
	10	Орша	S	2	SW	7	—	6	3	„
	19	Горкі	SW	4	SW	7	57	6	1	„
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцк	SE	4	SE	7	—	8	6	вільготная
	30	Мар'іна-Сосны	S	2	S	4	—	6	3	„
	21	Магілеў	SE	2	SE	9	—	6	3	сухая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	S	4	SW	4	—	6	3	сухая
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	SE	4	SE	9	—	9	3	—
	32	Жлобін	SE	4	SE	9	—	6	1	вільготная
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	SE	2	SW	7	—	8	6	вільготная
	37	Калінкавічы	SE	2	SE	7	—	3	3	сухая
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	45	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SE	4	SE	7	—	3	1	сухая
	35	Васілевічы	SE	4	SE	7	54	6	2	„
	40	Людвінава	—	—	—	—	—	—	—	—

Пачынаючы з 7-га кастрычніка, Беларусь пападае пад дзеянне вобласці павышанага ціску, якая складалася з мас кантынентальнага палярнага паветра, што павяло к значнаму паніжэнню тэмпературы.

Наогул гэта дэкада характэрна выпадзеннем невялікай колькасці ападкаў і рэзкімі зменамі тэмпературы.

Довгер.

Метэаралагічная характарыстыка з 1—10 кастрычніка 1934 г.

У тэмпературы паветра на працягу гэтай дэкады адбываліся значныя змены. У 1-ы дзень на ўсходзе БССР назіраліся сярэднія сутачныя т-ры +4 +6°, а на захадзе +8 +10°. У наступныя дні т-ра паступова павышалася і к 5-му—6-му дасягнула +15 +18°. Далей да канца дэкады т-ры паступова зніziліся да 8—10°. Сярэдняя дэкадная т-ра вагалася ад 12 да 14°, такім чынам былі вышэй нармальных на 5-6°. Максімальная т-ра была таксама надзвычай высокая для гэтай дэкады, яна дасягала 20—26°. Мінімальная тэмпература была ніжэй нуля ў Новым-Каралёве (Лёзненскага р-на), Горках і Чэрыкаве. На паверхні глебы наглядалася яшчэ больш нізкая т-ра.

Ападкаў за дэкаду выпала вельмі мала, асабліва незначная колькасць выпала ў паўднёва-ўсходняй частцы БССР, месцамі нават зусім не назіралася ападкаў. У паўночна-заходняй частцы выпалі невялікія ападкі да 10 мм. Выключэннем з'яўляюцца: Лепель, дзе выпала 14 мм і Дрысса—28 мм. Выпадалі ападкі ў большасці выпадкаў у сярэдзіне дэкады. 4-га, 5-га і 6-га месцамі назіраліся навальніцы.

Вятры пераважалі паўднёвых напрамкаў з сярэдняй хуткасцю ад 2 да 4 м/сек.

Воблачнасць у паўднёва-ўсходняй частцы БССР месцамі зніжалася да 30% агульнага пакрыцця неба, а ў паўночна-заходняй дасягала 100%.

Н. Малішэўская.

Метэаралагічная характарыстыка за жнівень 1934 г.

Тэмпература паветра ў гэтым месяцы па ўсёй БССР была вышэй нармальнай. Сярэдняя месячная т-ра роўна 17—19° у параўнанні з нармальнай яна вышэй некалькі больш чым на 1°. Самыя высокія т-ры наглядаліся ў першай дэкадзе, сярэднія сутачныя т-ры ў гэты час дасягалі да 20—23°. У другой дэкадзе т-ры паступова зніжаліся і сярэднія сутачныя т-ры дасягалі 13—15°. У канцы месяца т-ры зноў некалькі павысіліся. Максімальныя месячныя т-ры дасягалі 26—29°. Мінімальныя т-ры дасягалі 5—10°, наглядаліся яны пераважна 20 га і 21 га. Ападкі размеркаваліся вельмі нероўнамерна: На поўдні і ўсходзе БССР выпалі даволі вялікія колькасці ападкаў 80—100 мм. Зусім мала ападкаў выпала ў цэнтральнай частцы па лініі Полацк—Бярэзіна—Слуцк, ад 15 да 30 мм. У астатніх частках БССР выпала ў большасці 40—50 мм.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра: Сярэдняя	Тэмпература паветра: Адхіленне ад нормы	Тэмпература паветра: Максімал.	Тэмпература паветра: Дата	Тэмпература паветра: Мінімальная	Тэмпература паветра: Дата	Адносная вільг. у %: Сярэдняя	Адносная вільг. у %: Мінімальная	Тэмпература на паверхні глебы: Мінімальная	Тэмпература на паверхні глебы: Дата	Тэмпература на паверхні глебы: Лік дзён з тэмператур. глебы ≤0°	А п: Сума	А п: Норма
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	16.9	—	26.7	10	4.6	27	75	40	3.0	27	0	15	—
	3	Полацк	17.3	+1.4	26.7	10	6.1	27	75	40	—	—	—	27	79
	—	Вялікія Лукі	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	52	—
	—	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	17.0	+1.7	25.6	12	7.6	21	80	45	3.7	21	0	96	91
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	17.4	—	25.6	11,12	8.5	21	75	40	5.9	27	0	64	93
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	46	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	29	—
	13	Барысаў	17.8	+1.4	27.1	3	7.3	21	80	35	7.4	21	0	82	75
	16	Менск	17.5	+1.3	26.7	11	6.7	20	80	40	9.6	23,27	0	44	80
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	24	—
	23	Мар'іна-Горка	17.8	+1.3	26.1	24	6.9	20	75	45	6.7	27	0	21	77
	25	Асіпавічы	18.5	+1.4	28.4	10	7.6	20	75	40	8.9	23	0	71	—
	10	Орша	17.6	+1.4	26.4	12	8.2	21	75	45	8.7	21	0	51	77
	19	Горкі	17.4	+1.2	26.1	12	7.4	20	80	40	8.2	20	0	79	82
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	39	—
	28	Слуцк	17.8	—	26.5	5	8.3	20	80	50	8.3	23	0	31	—
	30	Мар.-Сосны	17.8	—0.6	27.1	5	6.3	23	80	45	—	—	—	86	—
	21	Магілеў	17.8	+1.2	26.8	12	9.1	21	80	40	—	—	—	64	79
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	17.7	+0.9	26.6	12	8.4	20	80	45	—	—	—	82	64
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	18.1	+1.0	26.5	4	8.8	21	75	45	7.1	21,28	0	52	—
	32	Жлобін	18.8	+1.7	27.8	4	9.3	20	75	40	—	—	—	47	—
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	18.6	+1.2	28.3	5	9.7	23	80	35	—	—	—	84	—
	37	Калінкавічы	18.6	+1.3	28.4	5	9.2	20	80	45	—	—	—	85	68
	39	Лельчыцы	19.2	—	29.5	5	9.6	23	85	45	—	—	—	105	—
	85	Чэчэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	54	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	65	—
	38	Гомель	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	35	Васілевічы	18.2	+1.0	27.9	4	8.0	20	80	40	7.2	23	0	56	70
	40	Людвінава	18.7	+0.9	27.8	5	8.2	21	80	40	8.3	21	0	74	—

назіранняў за жнівень месяц 1934 г.

а д к і ў м/м							Вецер		Воблачн. у 10-бальнай сістэме		Інсаляцыя ў %% магчымай	Лік дзён					
Лік дзён з ападкамі							Пераважаючы напрамак	Сярэдняя хуткасць	Агульная	Ніжняя		Ясных	Пахмурных	З туманам	З градам	З гразой	
≥ 0.1 мм	≥ 0.5 мм	≥ 1.0 мм	≥ 2.0 мм	≥ 5.0 мм	≥ 10.0 мм	≥ 20.0 мм											
8	6	5	1	1	0	0	W	2.5	6.1	4.2	—	3	10	4	0	6	—
8	6	5	4	2	1	0	W	2.3	6.3	4.6	—	3	9	4	0	1	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
9	8	8	6	4	3	0	—	—	—	—	—	—	—	3	0	2	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
10	7	6	6	6	5	2	E	1.8	5.7	4.3	—	2	9	4	1	2	—
9	9	9	8	5	3	0	E	2.2	6.3	4.6	—	2	10	8	0	5	—
13	7	7	5	3	1	1	—	—	—	—	—	—	—	5	0	0	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	12	11	10	5	2	1	NE	2.1	5.5	3.8	—	3	7	3	1	4	—
13	11	9	6	3	1	0	E	2.3	5.6	3.1	—	1	6	2	0	2	—
5	5	5	4	2	0	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
10	10	5	4	2	0	0	NW	2.6	6.4	3.4	—	0	11	2	0	5	—
9	8	7	6	4	2	2	S	2.1	5.4	2.8	—	5	7	4	0	2	—
13	9	7	5	5	1	0	NW	1.7	5.6	3.3	—	2	8	3	0	1	—
12	9	9	9	4	1	1	NE	2.3	6.0	3.1	—	3	9	5	0	3	—
7	6	4	4	4	1	1	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
11	7	6	4	3	1	0	E	2.9	6.4	4.5	—	1	8	4	0	4	—
14	9	6	6	5	4	2	E	2.1	5.9	3.0	—	2	8	5	0	1	—
12	8	7	7	5	3	0	NE	2.1	5.7	4.0	—	1	6	3	0	3	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
10	10	9	—	7	4	0	SW	3.2	5.9	4.8	—	0	5	2	0	7	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
12	8	8	6	3	2	0	S	2.3	5.8	4.1	—	3	8	8	0	3	—
11	8	7	5	3	1	1	SW	2.6	5.9	3.2	—	3	9	4	1	2	—
11	8	7	4	3	3	2	W	2.4	7.7	4.4	—	0	16	5	0	2	—
13	9	9	6	4	3	1	W	2.3	4.2	3.4	—	6	6	1	0	4	—
12	9	7	6	4	3	3	SW	2.4	5.3	4.0	—	2	6	6	0	1	—
13	10	9	6	2	2	0	—	—	—	—	—	—	—	0	0	0	—
8	8	7	6	4	2	1	—	—	—	—	—	—	—	6	0	4	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
13	10	6	4	2	2	1	NE	2.2	6.0	4.2	—	2	7	4	0	5	—
17	10	9	8	4	2	1	E	2.3	5.5	4.3	—	6	8	4	0	3	—

Асабліва значныя колькасці ападкаў выпалі на поўдні 5-га і 6-га, а па ўсёй БССР за выключэннем паўночнай часткі 13-га—16-га. Апошняя дэкада характарызавалася пераважна сухім надвор'ем.

Вятры пераважалі заходніх напрамкаў, з сярэдняй хуткасцю 2-3 м/сек. Воблачнасць была невялікай, у сярэднім складала 50—60% агульнага пакрыцця неба.

Н. Малішэўская

Сельска-гаспадарчая гідромет. характарыстыка з 1—10 кастрычніка 1934 г.

У параўнанні з папярэдняй дэкадай першая дэкада кастрычніка адзначаецца больш спрыяючым спалучэннем метфактараў для заканчэння ўборкі бульбы і разгортвання ўборкі больш позніх гародніх культур як капуста і караньплоды. Аднак малая колькасць ападкаў, асабліва, у паўднёвых раёнах рэспублікі неспрыяльна адбівалася на развіцці больш позніх пасеваў азімых. Азімае жыта знаходзіцца ў фазе кушчэння, азімая пшаніца—у фазе 3-х лістоў, пачатку кушчэння. Ацэнка як жыта так і пшаніцы—здавальняючая. З сельска-гаспадарчых работ на працягу дэкады апрача ўборкі бульбы і гародніны праводзілася зяблівае ворыва, малацьба і ўкладка ў хавальнікі бульбы і караньплодаў.

Прымаразкі, якія назіраліся ў гэту дэкаду (глядзі лічбовую табліцу) не былі шкоднымі як для азімых так і для гародніх культур.

В. Стэфановіч.

Да ўвагі с/гасп. метстанцый. Аб падачы с.-г. тэлеграм і запаўненні дэкадных бланкаў

У дасылаемых з метстанцый тэлеграмах і бланках сустракаецца шэраг недакладнасцей прычынай якіх у большасці з'яўляецца недастаткова ўважлівыя адносіны метназіральнікаў да запаўняемага і дасылаемага матэрыялу. Прывядзём некалькі прыкладаў неправільнай зашыфроўкі тэлеграм і запаўнення дэкадных бланкаў.

У тэлеграмах за 1 дэкаду кастрычніка дапушчаны наступныя памылкі: 1) метст. Васілевічы ў групе работа дае 62657, што азначае малацьба ільну падзімага пасева ў той час, як лён быў нармальнага вясенняга сева і патрэбна было зашыфраваць—61657 2) метст. Бычыха і Лепель падаюць у той-жа групе 01340, што азначае пасеў пад зіму азімага жыта ў той час як зусім зразумела, што для азімага жыта і азімай пшаніцы пасеў пад зіму з'яўляецца нармальным і таму патрэбна зашыфраваць 01320. Пасевам-жа пад зіму называецца пасеў з восені яравых культур. 3) Метст. Лепель, апрача таго, дае яшчэ 21688—што азначае ўборка цукровых буракоў і 34682—уборка цвятной капусты, убіраліся ж кармавые буракі і належыла зашыфраваць 22688 і качанная капуста шыфр—33682. 4) У тэлеграме метст. Турск прапушчана слова „работа".

У дэкадных с-гасп. бланках не падаецца копія шыфрованых тэлеграм наступнымі метст. Турск, Бычыха, Горкі, Чэрыкаў. Падача ж копіі тэлеграмы абавязкова з тэй прычыны, што бываюць выпадкі паступлення пераблытаных тэлеграм і пры адсутнасці копіі няма магчымасці ўстанавіць па чыёй віне, ці па віне падаўшага тэлеграму ці па віне тэлеграфа дапушчана памылка з мэтай папярэджання ад паўтарэння гэткіх. Метстанцыі Людвінова, Мар. Сосны і Дрыса запаўняюць бланкі алоўкам у той час як іх патрэбна запаўняць абавязкова чарнілам.

У выпадку калі ў справаздачную дэкаду назіраемая культура не выйшла ў новую фазу, то ў бланку павінна быць адзначана папярэднія фазы і дата яе наступлення. Гэта не робіцца метстанцыямі Слуцк, Дрыса, Чэрыкаў. Астаўленне-ж графы не запоўненай прымушае думаць, што назіранні зусім не вяліся.

Бываюць выпадкі, што метназіральнік дае ацэнку становішча культур, у прыватнасці азімых, ніжэй сярэдняй і дрэнную (2 і 1) без тлумачэння прычын выклікаўшых дрэннае становішча пасеваў у той час, як у такіх выпадках іх абавязкова трэба адзначаць.

Як недахоп патрэбна адзначыць і тое, што некаторыя метстанцыі пры дасылцы матэрыялу заклейваюць яго. Пры ўскрыцці такога заклеенага бланка бываюць выпадкі порчы яго.

Усе прыведзеныя недахопы павінны і могуць быць ізжыты. Неабходна толькі больш сур'ёзна і з большай адказнасцю адносіцца да выконваемай работы і ўлічыць адзначаныя вышэй памылкі з мэтай унікнення паўтарэння іх у далейшым.

В. Стэфановіч.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Друкарня БелАН. Зак. № 331. Гарліт № 5966. Тыр. 600 экз. 9 стар.

Москва
Софийская Набережная 38
Гидрометеорологическая
Станция И.Б.К.